УДК 94(476.5):331.105.44

# Старонкі гісторыі: узнікненне першых прафсаюзаў у Віцебскай губерні

**Мандрык І.У.**
***Установа адукацыі "Віцебскі дзяржаўны ўніверсітэт імя П.М. Машэрава" , Віцебск***

*У артыкуле разглядаецца важнейшы этап у гістарычным шляху прафсаюзных арганізацый Віцебскай губерні. Сістэмна раскрываецца перыяд стварэння і станаўлення грамадскіх арганізацый працоўных, якія з часу свайго заснавання імкнуліся выконваць ахоўныя і прадстаўнічыя функцыі.*

*Мэта даследавання – выяўленне прычын вытокаў прафсаюзнага руху на Віцебшчыне ў кантэксце іншых тэрыторый Паўночна-Заходняга краю, адзнака дзейнасці яго структур у забеспячэнні абароны работнікаў наёмнай працы на дакастрычніцкім этапе свайго існавання.*

***Матэрыял і метады.*** *У артыкуле ўжыты ўведзеныя раней у навуковы зварот выданні, у якіх раскрываецца гістарычны шлях прафсаюзнага руху Беларусі і Віцебскай губерні, дакументы Дзяржаўнага архіва Віцебскай вобласці, архіва Віцебскага абласнога аб'яднання прафсаюзаў. Пры даследаванні прымяняліся сістэмны, лагічны, параўнальны і праблемны метады.*

***Вынікі і іх абмеркаванне.*** *У канцы XIX – пачатку XX ст. у Паўночна-Заходнім краі Расіі пачынаецца аб'яднанне рабочых у прафесійныя арганізацыі. Галоўнай задачай у іх дзейнасці на гэтым этапе з'яўляецца патрабаванне годных умоў працы, справядлівай аплаты за працу і своечасовай яе выплаты. Лідзіруючае становішча ў стварэнні прафсаюзных арганізацый сярод беларускіх губерняў займала ў гэты час Віцебская губерня.*

***Заключэнне.*** *Гістарычны экскурс па дадзенай праблеме дазваляе сцвярджаць, што заснаванне прафсаюзаў у Віцебскай губерні, як і ўвогуле на беларускай тэрыторыі, пачынаецца ў час першых выступленняў рабочых супраць несправядлівых вытворчых адносін. Асэнсаванне свайго цяжкага становішча прывяло працоўны клас да неабходнасці сумеснай абароны сваіх законных правоў і інтарэсаў. Менавіта стачачныя камітэты, якія ўпарта вялі барацьбу з уладамі і работадаўцамі, з'яўляюцца папярэднікамі прафесійных саюзаў у Беларусі. Нягледзячы на складанасць умоў, адсутнасць вопыту, іх дзейнасць на гэтым этапе мела важкія дасягненні. Практычна ва ўсіх буйных гарадах Беларусі адбылося аб'яднанне рабочых, а разам з тым масавае фарміраванне прафсаюзаў па вытворчым прынцыпе. Віцебшчына ў гэтай справе займала лідзіруючыя пазіцыі. Прафсаюзныя арганізацыі прадпрыемстваў губерні сталі выкарыстоўваць сувымерныя з патрабаваннем часу формы і метады работы, не выключаючы палітычных патрабаванняў.*

***Ключавыя словы:*** *ахоўныя функцыі, аб'яднанне рабочых, забастовачны рух, справядлівая аплата працы, фабрычна-заводская прамысловасць.*

*(Ученые записки. – 2018. – Том 26. – С. 59–65)*

# Pages of History: Emergence of First Trade Unions in Vitebsk Province

**Mandrik I.V.**
***Educational Establishment "Vitebsk State P.M. Masherov University", Vitebsk***

*A most important stage in the historical road of trade unions in Vitebsk Province is considered in the article. The period of the establishment and maturation of public organizations of working people, which from the time of their emergence strived to perform protection and representative functions, is revealed in a systematic way.*

*The purpose of the research is to reveal reasons of the sources of trade union movement in Vitebsk Province in the context of other territories of the North-Eastern Region, evaluation of its branches' activities in providing protection of employees on the pre-October stage of its existence.*

***Material and methods.*** *Publications, which reveal the historical road of the trade union movement in Belarus and Vitebsk Province, are used in the article as well as documents of the State Archive of Vitebsk Region, Vitebsk Region Trade Union Association Archive in research circulation. The system, logical, comparative and problem methods were applied in the research.*

*Адрас для карэспандэнцыі: e-mail:* ivan_mandrik@mail.ru – **І.У. Мандрык**

***Findings and their discussion.*** *In the late XIX – early XX centuries in the North-Eastern Region of Russia workers started uniting in trade unions. The main task of their activities at that stage was demanding proper conditions of work, fair and timely wages. Vitebsk Province took the leading position in establishing trade unions among Belarusian Provinces at that time.*

***Conclusion.*** *The historical overlook into the issue under consideration makes it possible to state that the foundation of trade unions in Vitebsk Province, as on the territory of Belarus in general, started during first demonstrations of workers against unjust job relations. Understanding of their own exploited state lead the working class to the necessity in joint defense of their legal rights and interests. Strike committees which fought with the authorities and employers were the predecessors of trade unions in Belarus. In spite of the complexity of conditions, absence of experience, their activities were successful at that stage. Practically in all big cities of Belarus consolidation of workers took place and, simultaneously, mass organization of trade unions according to job areas. Vitebsk Province took the leading position. Trade unions of the Province industries started using forms and methods of work which corresponded to the requirements of time, including political demands.*

***Key words:*** *protection functions, unions of workers, strike movement, fair wages, factory industries.*

*(Scientific notes. – 2018. – Vol. 26. – P. 59–65)*

Гістарыяграфія і крыніцы пра прафсаюзы Беларусі дазваляюць з высокай ступенню дакладнасці сцвярджаць, што іх стварэнне тут, як і ў іншых краінах свету, звязана з развіццём буржуазнага грамадства. У краінах, якія сталі на шлях індустрыялізацыі, адразу ж выразна праявіліся складанасці ва ўзаемаадносінах паміж класамі. Імкненне ўласнікаў да атрымання высокага прыбытку і мінімізацыі выдаткаў на працоўную сілу і на зарплату прыводзіла да высокай ступені эксплуатацыі наёмных работнікаў. Неверагодна цяжкія ўмовы працы, нізкая заработная плата, да таго ж і адсутнасць дэмакратыі, спараджалі незадаволенасць і пратэсты працоўных. Гістарычна склалася так, што ў развітых краінах самымі структураванымі масавымі грамадскімі арганізацыямі, якія аб'ядналі намаганні наёмных работнікаў у патрабаванні годных умоў працы, кошту працы (адпаведна з намаганнямі на вытворчасці), своечасовай яе выплаты, з'яўляліся прафсаюзы.

У Англіі, якая ў ліку першых правяла прамысловы пераварот і дзе працоўны клас падвяргаўся высокай ступені эксплуатацыі, аб'яднанне рабочых у прафесійныя арганізацыі пачалося ўжо ў другой палове XVIII стагоддзя. У ЗША, Францыі, Расіі, іншых краінах станаўленне і развіццё прафсаюзнага руху адбывалася пазней, але ў цэлым па англійскім узоры.

У Беларусі на першапачатковым этапе ствараліся арганізацыі для падтрымкі працоўных у форме рабочых гурткоў, цэхавых сходак, стачачных кас, кас узаемадапамогі. У далейшым паступова складваліся прафсаюзныя ячэйкі для аб'яднання намаганняў у адстойванні патрабаванняў рабочых да ўласнікаў. У большасці іх дзеянні насілі спарадычны характар і не выходзілі за рамкі аднаго прадпрыемства. Якасна новая старонка ў рабочым руху Беларусі, якая характарызавалася стварэннем прафсаюзаў па галіновым прыкметам, разгарнулася ў пачатку ХХ ст. Пераход да фабрычна-заводскай прамысловай вытворчасці склаў новую рэчаіснасць: узніклі істотныя супярэчнасці паміж гандлёва-прамысловай буржуазіяй і рабочым класам. З гэтага часу ў Віцебскай губерні пачынае афармляцца арганізаваны прафсаюзны рух, цесна звязаны з дзейнасцю рэвалюцыйных сацыял-дэмакратычных гурткоў і груп.

Мэта даследавання – выяўленне прычын вытокаў прафсаюзнага руху на Віцебшчыне ў кантэксце іншых тэрыторый Паўночна-Заходняга краю, адзнака дзейнасці яго структур у забеспячэнні абароны работнікаў наёмнай працы на дакастрычніцкім этапе свайго існавання.

**Матэрыял і метады.** Пры даследаванні праблемы выкарыстоўваліся ўведзеныя раней у навуковы зварот фундаментальныя выданні і артыкулы, у якіх высвятляецца гістарычны шлях прафсаюзнага руху на Беларусі. У якасці дакументальнай базы дадаткова прыцягнутыя архіўныя дакументы Нацыянальнага гістарычнага архіва, Дзяржаўнага архіва Віцебскай вобласці, архіва Віцебскага абласнога аб'яднання прафсаюзаў (пратаколы, стэнаграмы, рэзалюцыі прафсаюзных з'ездаў, канферэнцый). Вялікую каштоўнасць уяўлялі таксама літаратура па гісторыі Беларусі, шматлікія аўтарскія публікацыі апошняга дзесяцігоддзя, што асвятляюць гісторыю, тэорыю і практыку прафсаюзаў. Пры даследаванні прымяняліся сістэмны, лагічны, параўнальны і праблемны метады.

**Вынікі і іх абмеркаванне.** Прафсаюзныя арганізацыі Беларусі ў 2014 г. адзначылі 110-ю гадавіну з дня свайго стварэння. Прычыны з'яўлення прафсаюзаў у Беларусі на раннім этапе, як і ў іншых краінах свету, абумоўлены ўсім ходам эканамічнага і палітычнага развіцця буржуазнага грамадства. Пры яго станаўленні адбываюцца канцэнтрацыя вытворчасці і капіталу, рост наёмных прамысловых рабочых. Сам па сабе такі ход падзей мае прагрэсіўны характар. Хуткімі тэмпамі ідзе індустрыялізацыя прамысловасці, наступае высокая ступень урбанізацыі, робяцца навейшыя навуковыя адкрыцці, наглядаецца актыўны прырост насельніцтва.

У Расійскай дзяржаве імклівае развіццё буржуазных адносін адбылося пасля адмены прыгоннага права і буржуазных рэформ 60–80-х гг. У другой палове XIX ст. Расія за кароткі тэрмін увайшла ў пяцёрку найбольш эканамічна развітых краін свету.

У Паўночна-Заходняй частцы Расіі (беларускія землі) гэтыя ж самыя падзеі ствараюць перадумовы для інтэнсіўнага гаспадарчага развіцця. Рэзка павялічваюцца аб'ёмы як прамысловай, так і сельскагаспадарчай прадукцыі. Адбываецца

хуткі рост насельніцтва: за 1863–1897 гг. насельніцтва Беларусі павялічылася амаль у два разы і складала 6,5 млн чалавек, а колькасць жыхароў гарадоў за гэты час узрасла з 350 тыс. да 655 тыс. Такая ж тэндэнцыя наглядаецца на тэрыторыі Віцебскай губерні: у Віцебску ў 1860 г. налічвалася 29,5 тыс. чалавек, а ў 1897 г. насельніцтва горада павялічылася больш чым у два разы – да 65,9 тыс.

У губерні ўзводзяцца чыгуначныя шляхі, фарміруецца фабрычна-заводская прамысловасць. У 1866 г. праз тэрыторыю губерні пракладзена Рыга-Арлоўская чыгунка (участак Дзвінск–Полацк–Віцебск), праз два гады чыгуначныя лініі звязалі гарады Віцебскай губерні са Смаленскам, пазней – з Раслаўлем, Бранскам, Арлом, Масквой, Пецярбургам, Кіевам, Брэстам. У 1907 г. чыгунка прайшла праз Невель–Полацк–Круляўшчызну. У выніку ў межах Віцебскай губерні да 1917 г. было пабудавана амаль 800 км чыгункі, што складала на гэты час прыкладна трэцюю частку агульнай даўжыні чыгуначнага палатна Беларусі. Чыгуначная сетка звязала Віцебшчыну з важнейшымі індустрыяльнымі цэнтрамі краіны і аказала значны ўплыў на фарміраванне тут фабрычна-заводскай гаспадаркі [1, с. 4; 2, с. 150]. У 1877 г. у Віцебску заснаваны чыгуналіцейныя майстэрні, у 1883 г. – табачна-махорачная, у 1892 – акулярная, у 1898 – папярова-карданажная фабрыкі. У 1897 г. у горадзе працавала 102 фабрычна-заводскіх і больш за 1700 дробных саматужных прадпрыемстваў. Да буйнейшых прадпрыемстваў належала ільнопрадзільная фабрыка “Дзвіна”, створаная ў 1902 г. руска-бельгійскім замежным капіталам на 1000 рабочых месцаў. На фабрычна-заводскіх прадпрыемствах горада было занята 1500 рабочых, на дробных саматужных – 5000. З прыведзеных лічбаў па Віцебску (такія абставіны назіраліся ў іншых гарадах і мястэчках) магчыма зрабіць выснову, што асаблівасцю прамысловай рэвалюцыі ў Віцебскай губерні стала разгортванне ў асноўным харчсмакавай, тэкстыльнай і дрэваапрацоўчай галін. Акрамя тэкстыльнай (фабрыка “Дзвіна”) астатнія заставаліся пакуль параўнальна невялікімі прадпрыемствамі саматужнай рамеснай вытворчасці.

У канцы XIX ст. удзельная вага прадпрыемстваў саматужнай рамеснай вытворчасці ў Беларусі складала не меней за 70%, яны больш чым у пяць разоў пераўзыходзілі фабрычна-заводскую прамысловасць. Умовы працы і заработная плата на іх была значна горшай, чым у сярэднім па Расійскай імперыі. Працягласць працоўнага дня наёмнага работніка на беларускіх прадпрыемствах замест прадугледжаных законам 11,5 гадзіны складала 12–14 гадзін, сярэдняя зарплата рабочых (Віцебская губерня не з’яўлялася выключэннем) была ў два разы ніжэй, чым у цэлым па Расіі. Шматлікія штрафы адбіралі больш за 30% заробку: у 1901 г. у пяці беларускіх губернях былі аштрафаваны 44% (!) усіх працоўных. Шырока выкарыстоўвалася дзіцячая праца і ў той жа час узрастала беспрацоўе: у 1907 г. толькі ў Віцебску было зарэгістравана 1200 беспрацоўных [3, с. 4].

Атрыманне высокага прыбытку, аб чым у першую чаргу клапаціліся ўласнікі, поўная адсутнасць дэмакратыі, у тым ліку і ў палітыцы, абумовілі незадаволенасць рабочага класа сваім становішчам, фарміравалі пратэстны настрой [14, с. 5; 5, с. 173].

У гэтых умовах рабочыя пачалі ўсведамляць, што яны, як уласнікі рабочай сілы, вельмі танна яе прадаюць. Каб паспяхова супрацьстаяць уладам і работадаўцам, ім неабходна цеснае згуртаванне [6, с. 6–7].

Ужо ў 1870–1880-я гг. на прадпрыемствах Беларусі сталі спарадычна ўзнікаць пярвічныя аб’яднаныя формы працоўных: стачачныя касы, рабочыя гурткі, бальнічныя і пахавальныя касы і інш. Іх асноўнай мэтай павінна было з’явіцца аказанне матэрыяльнай дапамогі сваім членам. На тэрыторыі Віцебскай губерні аб’яднанні рабочых і служачых для сумеснага адстойвання сваіх правоў у вышэйназваных формах узніклі ў гэты ж час спачатку на ўскраіне губерні – у Латгаліі, затым – у Віцебску, Оршы і Полацку [7, с. 10; 8, с. 336].

У канцы 90-х гадоў XIX ст. у гарадскіх цэнтрах Віцебскай губерні пачынае афармляцца арганізаваны працоўны рух, цесна звязаны з дзейнасцю рэвалюцыйных сацыял-дэмакратычных гурткоў і груп [7, с. 9–15; 9, с. 5; 10, с. 1]. Перш за ўсё гэта адносіцца да створанага па нацыянальным прынцыпе ў 1897 г. Усеагульнага яўрэйскага працоўнага саюзу ў Літве, Польшчы і Расіі (Бунд) і Расійскай сацыял-дэмакратычнай рабочай партыі бальшавікоў (РСДРП(б)) [11, с. 28]. Як адзначаюць даследчыкі і непасрэдныя ўдзельнікі тых падзей, прафсаюзныя арганізацыі на Беларусі з’яўляліся па сутнасці першаснымі ячэйкамі Бунда, яны карысталіся нават правам пэўнай аўтаноміі па абранні цэнтральных органаў гэтай палітычнай арганізацыі [12, с. 17].

Вядомы віцебскі бальшавік Б.Д. Пінсан, які стаў членам РСДРП у 1907 г. і пачаў сваю рэвалюцыйную дзейнасць у віцебскім прафсаюзе друкароў, ацэньваючы структуру бундаўскіх арганізацый, адзначаў, што ўвесь рэвалюцыйны рух тут, на мясцовым узроўні, развіваўся на глебе нелегальнай прафесійнай арганізацыі рабочых і арганізацыі стачачнай барацьбы. Фактычна прафсаюзы як першыя нелегальныя арганізацыі працоўных прадстаўлялі адначасова і сацыял-дэмакратычныя партыйныя арганізацыі [13, с. 4–8]. Рабочыя гурткі, касы ўзаемадапамогі, стачачныя фонды, цэхавыя сходкі з’яўляліся самымі моцнымі і надзейнымі рэвалюцыйнымі цэнтрамі, дзе канцэнтравалася вялікая частка партыйнай працы [14, с. 10].

Разгортванне стачачных форм барацьбы за лепшыя ўмовы працы патрабавала далейшага згуртавання рабочых. Такое аб’яднанне ў гарадах Віцебскай губерні адбылося ў 1897–1900 гг. На думку вядомага беларускага гісторыка М. Біча, у гэты перыяд на тэрыторыі Беларусі найбольшай актыўнасцю выдзяляліся працоўныя Віцебска [15, с. 133].

Адна з першых забастовак рабочых адбылася на Віцебскай шчацiннай фабрыцы. Уласнікамі

былі пачуты і выкананы патрабаванні рабочых: працоўны дзень скараціўся з 16 да 12 гадзін.

У 1898–1900 гг. у забастоўках на прадпрыемствах Віцебскай губерні прынялі ўдзел да 3600 чалавек. У 1900 г. двойчы баставалі рабочыя тытунёва-махорачнай фабрыкі. Вясной і летам 1900 г. адбыліся чатыры эканамічныя забастоўкі ў Оршы (у кравецкай, шавецкай, сталярнай і тапачнай майстэрнях) [15, с. 131]. Страйкі на дробных прадпрыемствах праходзілі ў гэты час у Полацку, Дзвінску і іншых буйных цэнтрах губерні. У Віцебску эканамічная забастоўка з удзелам 15 рабочых гарбарнай майстэрні адбылася ў 1901 г.

На базе стачачных кас фарміруюцца падпольныя цэхавыя (прафесійныя) саюзы. Застрэльшчыкам тут выступілі рабочыя шчацінных майстэрняў. Услед за імі на пачатку новага стагоддзя на шлях прафесійнага аб'яднання ўступаюць гарбары.

У 1904 г. адбываецца масавае фарміраванне прафсаюзаў па вытворчым прынцыпе практычна ва ўсіх буйных гарадах Беларусі. На Віцебшчыне ў гэтым годзе стварылі прафсаюзную арганізацыю віцебскія гарбары. Менавіта ад 1904 г. вядзецца адлік стварэння арганізаванага прафсаюзнага руху на Беларусі.

На першапачатковым этапе дзейнасць прафсаюзаў па абароне правоў рабочых у асноўным абмяжоўвалася патрабаваннем больш бяспечных умоў працы і павелічэння аплаты за яе. Упартую барацьбу вялі прафсаюзныя арганізацыі з штрэйкбрэхерамі, якія ў вострыя моманты займалі пазіцыю работадаўцаў.

Якасна новы этап у станаўленні прафсаюзаў Віцебшчыны звязаны з пачаткам рэвалюцыі 1905–1907 гг. Царскі маніфест ад 17 кастрычніка 1905 г., які дэкляраваў свабоду сходаў і саюзаў, па сутнасці, легалізаваў прафсаюзную дзейнасць. Разам з выступленнем пецярбургскіх рабочых у Віцебскай губерні ўжо на пачатку рэвалюцыйных падзей адбыліся масавыя выступленні працоўных з эканамічнымі і палітычнымі патрабаваннямі. На прадпрыемствах дзейнічалі забастовачныя саветы і камітэты, ствараліся рабочыя дружыны. 18 кастрычніка 1905 г. у Віцебску адбылася 20-тысячная дэманстрацыя працоўных у падтрымку Кастрычніцкай Усерасійскай палітычнай стачкі.

Многія прафсаюзы ўзнікаюць пад прамым уплывам агульнарасійскіх галіновых арганізацый. Так, па закліку Усерасійскага саюза чыгуначнікаў рашэнне аб стварэнні сваёй прафесійнай арганізацыі было падтрымана і прынята чыгуначнікамі Оршы. Адначасова прадстаўнікі з Дзвінска і Оршы бралі ўдзел у працы з'езду паштова-тэлеграфных служачых, які адбыўся ў лістападзе 1905 г. у Маскве. Развіццё рэвалюцыйных падзей прывяло да рэзкай палітызацыі даволі значнай часткі насельніцтва і фактычнага зліцця прафесійных арганізацый з партыйнымі [16].

Рэвалюцыя прымусіла кіруючыя дзяржаўныя колы пайсці на распрацоўку заканадаўчай базы дзейнасці прафсаюзаў. 4 сакавіка 1906 года былі выдадзены "Часовыя правілы аб прафесійных таварыствах, што заснаваны для асоб, занятых у гандлёвых і прамысловых прадпрыемствах, або для ўладальнікаў гэтых прадпрыемстваў". Правілы вызначалі прававое становішча прафесійных супольнасцяў, забаранялі іх удзел у палітычнай дзейнасці, прадугледжвалі стварэнне губернскіх асаблівых па справах аб таварыствах прысутнасцяў, дзе адбываліся зацвярджэнне статутаў і выдача дазволаў на стварэнне прафсаюзаў, акрамя стварэння галіновых прафсаюзаў у рэгіянальным маштабе (іх стварэнне і дзейнасць забаранялася) [11; 17; 18].

Легалізацыя прафсаюзнай дзейнасці дазволіла выйсці з падполля ўжо створаным прафесійным арганізацыям. Адначасова ўзнікаюць новыя [19]. Сярод беларускіх губерняў лідзіруючае становішча ў фарміраванні прафсаюзных арганізацый займала ў гэты час Віцебская губерня [20]. На працягу двух гадоў (1906–1907 гг.) на тэрыторыі губерні было афіцыйна адкрыта 39 прафсаюзаў (для параўнання: у Мінскай губерні зарэгістравана 13 прафсаюзаў, Гродзенскай – 28, Магілёўскай – 2). Асабліва бурны рост прафсаюзных арганізацый прыпадае на лета 1906 г. Толькі ў жніўні 1906 г. у Віцебску было зарэгістравана больш за дзясятак новых прафсаюзаў, за ўвесь 1906 г. рэгістрацыю набыў 21 прафсаюз. Сярод іх – прафсаюзы слесараў, кавалёў, булачнікаў, будаўнікоў, чыгуначнікаў, рабочых півапарных прадпрыемстваў, зубных лекараў і дантыстаў, ювеліраў. У прафсаюзны рух на гэтым этапе ўключаецца інтэлігенцыя. 13 чэрвеня 1906 г. у Віцебску на губернскім з'ездзе настаўнікаў было прынята рашэнне аб стварэнні прафсаюзнай арганізацыі працаўнікоў адукацыйных устаноў.

Фарміруюцца прафсаюзы і ў іншых гарадах Віцебскай губерні: у Полацку пачынае працу прафсаюз гандлёва-прамысловых служачых і настаўнікаў; у Оршы – чыгуначнікаў і паштова-тэлеграфных работнікаў [13].

Тэндэнцыю пераходу ад эканамічных патрабаванняў да палітычнай дзейнасці выдатна ілюструе данясенне віцебскага губернатара. У 1907 годзе ён пісаў: "Моладзь, якая жыве ў гарадах Віцебскай губерні, арганізавалася ў прафесійныя супольнасці, і ў большасці, пад выглядам абароны эканамічных інтарэсаў сваіх членаў, стала на рэвалюцыйны шлях. Дзейнічаючы спачатку вельмі асцярожна, некаторыя прафсаюзныя супольнасці ў апошні час ... праявілі пагрозлівую дзяржаўнаму парадку і грамадскай бяспецы дзейнасць, якая выяўляецца ў арганізацыі забастовак служачых і рабочых у гандлёва-прамысловых установах і майстэрнях" [21, с. 32]. Адстойванне сваіх пазіцый рабочым класам у час першай буржуазна-дэмакратычнай рэвалюцыі толькі нарастала. З мэтай больш згуртаванай каардынацыі прафсаюзных дзеянняў на рэгіянальным узроўні ў Віцебску і Полацку былі створаны цэнтральныя бюро прафсаюзаў, якія існавалі нелегальна.

Актывізацыя прафсаюзнай дзейнасці, палітызацыя патрабаванняў устрывожыла царскія ўлады, выклікала ў адказ карныя меры. У лютым 1907 г. у Віцебску паліцыя зрабілаператрус дакументаў прафсаюза будаўнічых рабочых. На момант правядзення вобыску ў памяшканні знаходзілася каля паўсотні чалавек. Па данясенні прыстава пры з'яўленні паліцыі прысутныя тут людзі сталі хутка знішчаць пракламацыі з заклікамі звяржэння самадзяржаўя. У працоўных знойдзены ўлёткі РСДРП(б), забароненыя брашуры і кнігі. Па распараджэнні ўлад прафсаюз будаўнічых рабочых быў зачынены, а яго лідары арыштаваныя. У 1908 г. у Віцебску было ліквідавана 12 прафсаюзаў, у Полацку – 2, Дзвінску – 11. За арганізацыю стачкі ў гэтым годзе забаранілі дзейнасць самага буйнога ў губерні прафесійнага аб'яднання друкароў. Пад рознымі падставамі губернская адміністрацыя адмаўляла ў рэгістрацыі новых прафсаюзаў. За арганізацыю стачачнай барацьбы і цеснае ўзаемадзеянне з палітычнымі арганізацыямі многія кіраўнікі прафсаюзных супольнасцяў і актыўныя ўдзельнікі рэвалюцыйных падзей былі падвергнуты рэпрэсіям. Толькі за адзін 1906 г. паліцыя знайшла падставу для арышту больш за 1 тыс. жыхароў Віцебска [22, с. 19].

Аднак рэпрэсіі не спынілі працу прафсаюзаў. Перайшоўшы на нелегальнае становішча, яны ва ўмовах рэакцыі, па-ранейшаму ў самых актыўных формах працягвалі барацьбу за эканамічныя інтарэсы працоўных. У жніўні 1908 г. у Віцебску баставаў увесь калектыў льнопрадзільнай фабрыкі “Дзвіна” (1050 чалавек). Рабочыя патрабавалі павышэння зарплаты, звальнення тэхнічнага дырэктара, вызвалення арыштаваных арганізатараў забастоўкі. Гэта была адна з буйнейшых у Беларусі стачак перыяду палітычнай рэакцыі.

Ва ўмовах жорсткіх рэпрэсій эканамічная барацьба прафсаюзаў спалучалася, як і раней, з палітычнай дзейнасцю. Удзельнікі прафсаюзнага руху распаўсюджвалі нелегальную літаратуру, на прафсаюзных сходах разглядалася палітычная тэматыка. Прычым актыўны ўдзел у гэтым бралі члены не толькі падпольных, але і легальных прафсаюзаў.

У Віцебску, напрыклад, прафесійнае грамадства краўцоў, шаўцоў і прыказчыкаў арганізавала сумесны сход, на якім прынялі заяву-пратэст супраць суда над былымі членамі сацыял-дэмакратычнай фракцыі ІІ Дзяржаўнай думы.

З паліцэйскіх данясенняў можна ўбачыць, што ў гэты перыяд прафсаюзныя арганізацыі губерні праяўлялі значную ўвагу да палітычнай літаратуры. У адным з данясенняў даводзіцца, што кіраўніцтва прафсаюза краўцоў на агульных сходах практыкуе правядзенне гутарак і чытанне лекцый на забароненыя тэмы. Тэматыка лекцый ахоплівала многія палажэнні марксізму, адна з іх – “К. Маркс аб кааператыўных таварыствах”. Пры вобыску памяшкання гэтага прафсаюза паліцыяй у маі 1908 г. былі выяўленыя брашуры, фатаграфіі думскіх сацыял-дэмакратаў у зале суда на лаве падсудных і іншая літаратура з заклікамі палітычнага характару.

Пры вобыску паліцыяй будынка віцебскага прафсаюза шчаціншчыкаў было канфіскавана 14 брашур і некалькі іншых кніг “падрыўнога ўтрымання”. Не выпадкова ў паліцэйскіх рапартах значылася, што “члены (дадзенага. – *І.М.*) аб'яднання больш займаюцца чытаннем нелегальнай літаратуры і гутаркамі палітычнага характару”.

Нягледзячы на забарону стварэння прафсаюзаў па галіновым і тэрытарыяльным прынцыпах, разгром паліцыяй сфарміраваных у буйных цэнтрах Віцебскай губерні гарадскіх цэнтральных бюро, тэндэнцыя да тэрытарыяльнага аб'яднання прафсаюзных ячэек выяўлялася ўсё больш настойліва. У кастрычніку 1909 г. у Дзвінску адбыўся галіновы з'езд саюза шчаціншчыкаў, які адыграў вельмі важную ролю ў прафсаюзным руху Паўночна-Заходняга краю ў цэлым і Віцебскай губерні ў прыватнасці. У працы з'езда бралі ўдзел прадстаўнікі ад Віцебска, Оршы і Мінска. Ва ўмовах найвышэйшага росквіту рэакцыі, калі любая спроба супрацьстаяння з работадаўцам і нейкае падазрэнне ў прафсаюзнай дзейнасці вялі да залічэння ў “чорныя спісы”, што пагражала неадкладным звальненнем і беспрацоўем, дэлегаты з'езда прадэкларавалі рашучасць “стаяць на сваім, ні пад якім выглядам і ні пры якіх умовах не згаджацца з 10-гадзінным працоўным днём”. З'езд выказаў падзяку сацыял-дэмакратычнай фракцыі Дзяржаўнай думы за клопат пра інтарэсы працоўнага класа, а таксама братам па класе іншых нацый за салідарнасць і падтрымку. Узнімалася на з'ездзе і пытанне аб барацьбе з работадаўцамі за выдачу паліцыі рабочых, якія займаюцца прафсаюзнай дзейнасцю [23, с. 11].

Змрочны перыяд рэакцыі сур'ёзна падарваў сілы прафсаюзаў. У 1909–1910 гг. назіраецца рэзкі спад прафсаюзнага руху. Аднак гэты перыяд доўжыўся нядоўга. З 1911 па 1914 г. прафсаюзы, якія страцілі многіх сваіх самых актыўных членаў, павольна, але ўпэўнена аднаўлялі сілы. Да студзеня 1912 года ў Віцебску аднавілі сваю дзейнасць ужо 8 легальных прафсаюзаў. Функцыянавалі прафсаюзы ў Полацку, Дзвінску і Оршы. Пад іх уплывам у 1911 г. у Віцебску страйкавалі рабочыя фабрыкі “Дзвіна” (звыш за 1000 чал.), абутковых майстэрняў (432 чалавекі) з патрабаваннямі павышэння заработнай платы. Распачатае ажыўленне прафсаюзнага руху выклікала трывогу ўладных структур. Яны робяць шэраг мер, накіраваных на ўзмацненне жорсткасці кантролю за прафсаюзнай дзейнасцю. У верасні 1912 г. Міністэрства ўнутраных спраў разаслала губернатарам і кіраўнікам гарадоў цыркуляр, дзе патрабавала звярнуць увагу “на шырокае развіццё ў Імперыі прафесійнага руху і на тое значэнне, якое надаюць гэтаму руху супрацьурадавыя партыі, якія паставілі на мэце аб'яднаць сваім уплывам прафесійныя структуры і саюзы і стварыць з іх палітычна арганізаваную сілу” [24, с. 43].

Цыркуляр прадпісваў мясцовым уладам весці энергічную барацьбу супраць прафсаюзаў. Іх дзейнасць была пастаўлена пад жорсткі кантроль паліцыі. У сувязі з гэтым рэзкага росту прафсаюзнага руху ў Віцебскай губерні на працягу 1913 і першай палове 1914 года неназіралася, наадварот, частка прафсаюзаў была ліквідавана.

З пачаткам Першай сусветнай вайны ўрад аб'явіў губерням Паўночна-Заходняга краю ваеннае становішча. Дзейнасць палітычных партый і прафесійных саюзаў была забаронена. Але і ў гэтых складаных умовах ваеннага часу і разгулу мілітарызму працоўны клас не заставаўся раз'яднаным у адстойванні сваіх правоў. Нягледзячы на забарону, прафсаюзы і ў нелегальных умовах працягвалі сваю ахоўную дзейнасць, падтрымлівалі працаўнікоў у іх патрабаваннях да ўладальнікаў праз забастовачны рух [25, с. 178]. Асабліва вылучаліся актыўнасцю прафсаюзныя камітэты Віцебска, які ў гэты час стаў буйнейшым прамысловым цэнтрам на Беларусі. Тут у 1914 г. дзейнічала 45 фабрык і заводаў, працавала каля 8 тыс. рабочых, з іх 40% было занята ў тэкстыльнай і каля 20% – у металаапрацоўчай галінах. На шасці прадпрыемствах налічвалася 100 і больш рабочых. На самым буйным прадпрыемстве – на фабрыцы "Дзвіна" – працавала 1200, а ў канцы 1914 г. – 1700 чалавек [22, с. 20]. У горад, які быў прыфрантавым, па мабілізацыі прыбыло шмат кваліфікаваных рабочых з Масквы, іншых прамысловых цэнтраў, асела нямала бежанцаў з акупіраваных кайзераўскімі войскамі рэгіёнаў Прыбалтыкі. Усё гэта ўмацавала пазіцыю прафсаюзаў пры адстойванні інтарэсаў працоўных. Выкарыстоўваліся любыя легалізаваныя і нелегалізаваныя формы працы сярод рабочых. Ствараліся аб'яднанні ўзаемадапамогі, бальнічныя касы, рабочыя гурткі, працоўныя кааператывы, не адмаўляліся і забастовачныя выступленні. З удзелам прафсаюзаў у горадзе створана легальная бальнічная каса "Дапамога", ва ўмовах дэфіцыту прадуктаў харчавання, продажу іх па спекулятыўным коштам, прафсаюзы праз працоўныя кааператывы дабіваліся нарміраванага забеспячэння насельніцтва прадуктамі харчавання. У студзені 1914 г. з патрабаваннямі эканамічнага характару баставаў калектыў шчаціннай фабрыкі (100 чалавек), а таксама двух заводаў сельгасінвентара (78 рабочых). Страйкавалі падчас вайны рабочыя Дуброўна, будаўнікі чыгуначнага ўчастка Орша–Варожба.

Лютаўская буржуазна-дэмакратычная рэвалюцыя 1917 г. дала для прафсаюзаў магчымасць легалізаваць сваю дзейнасць. Ужо ў сакавіку-красавіку гэтага года ў Віцебскай губерні аднавілі працу звыш за 50 прафесіянальных саюзаў. У ліку першых, хто арганізацыйна аформіў свае прафесійныя арганізацыі, былі чыгуначнікі. У сакавіку на станцыі Віцебск (тады гэта была структура Рыга-Арлоўскай чыгункі) створана прафсаюзная арганізацыя інжынерна-тэхнічных работнікаў, сярэдніх і малодшых служачых. У Полацку ў прафсаюзную арганізацыю аб'ядналіся рабочыя паравознага дэпо, а таксама работнікі службы пуці, руху і тэлеграфа, пасля чаго ўсе яны прынялі ўдзел у выбарах вузлавога камітэта прафсаюзаў. 11 сакавіка 1917 г. аднавілася прафсаюзная дзейнасць у паравозным дэпо, на чыгуначнай станцыі і тэлеграфе ў Оршы.

Да канца сакавіка гэтага ж года аформіліся прафсаюзныя арганізацыі на прадпрыемствах гарбарнай, швейнай, металаапрацоўчай прамысловасці, у асобных рэгіёнах – спецыялістаў сельскай гаспадаркі. У часы двоеўладдзя прафсаюзы патрабавалі ад уласнікаў прадпрыемстваў паляпшэння эканамічнага становішча, павышэння заработнай платы. Часцей за ўсё з-за меркавання асабістай бяспекі ўлады і буржуа імкнуліся гэтыя патрабаванні задаволіць. У выпадку адмовы прафсаюзы аб'яўлялі забастоўку. У "Известиях Витебского Совета" ад 13 ліпеня 1917 г. паведамлялася, што ўжо на працягу чатырох тыдняў працягваецца забастоўка членаў прафсаюза шчацінщчыкаў Віцебска. Зацяжны характар набыў страйк работнікаў па апрацоўцы скур. Завяршыўся ён толькі з поўным задавальненнем патрабаванняў удзельнікаў. Такі ж вынік мелі выступленні рабочых на лесапільным заводзе Мельцара і іншых прадпрыемствах. Безумоўна, стачачная барацьба рабочых прадпрыемстваў Віцебскай губерні летам 1917 г. згуртавала іх рады, дапамагла арганізацыйнаму афармленню прафсаюзных і фабрычна-заводскіх камітэтаў. У гэты час прафсаюзы найбольш блізка падышлі да практычнай рэалізацыі аднаго з найважнейшых палажэнняў сацыялістычнай тэорыі пра ажыццяўленне рабочага кантролю за вытворчасцю і размеркаваннем. Фабрычна-заводскі камітэт фабрыкі "Дзвіна" 2 жніўня 1917 г. сваім рашэннем зацвердзіў працоўны дзень для асоб, якія не дасягнулі ўзросту 20 год, у памерах не больш за 5 гадзін 30 хвілін (адмяніў распараджэнне адміністрацыі аб больш працяглым працоўным часе). Тут жа было прынята рашэнне аб арганізацыі вытворчага працэсу ў тры змены. Такім чынам, яшчэ за некалькі месяцаў да кастрычніка 1917 г. працоўныя Віцебшчыны праявілі сябе ў здольнасці кіраўніцтва прадпрыемствамі.

Кастрычніцкая сацыялістычная рэвалюцыя прывяла да ўзнікнення новага тыпу прафсаюзаў. Як уяўлялася кіраўніцтву краіны, у грамадстве, дзе ў корані зменена становішча працоўных, адсутнічае прыватная ўласнасць на сродкі вытворчасці, прафсаюзы павінны падтрымліваць уладу, а цэнтр сваёй працы перанесці ў галіну арганізацыйна-гаспадарчай і выхаваўчай дзейнасці. Прафсаюзы аказаліся моцна ўключанымі ў дзяржаўную сістэму. Ім адводзілася роля школы выхавання, школы кіравання гаспадарчым і культурным будаўніцтвам.

**Заключэнне.** Такім чынам, гістарычны вопыт падказвае, што найбольш эфектыўны шлях аба-

роны сваіх правоў і інтарэсаў, які працоўныя Англіі адшукалі яшчэ ў канцы XVIII ст., – гэта аб'яднанне ў прафесійныя арганізацыі. Стварэнне і станаўленне прафсаюзаў у Паўночна-Заходнім краі Расіі адбылося значна пазней (канец XIX ст. – пачатак XX ст.). З'яўленне прафесійных арганізацый тут выклікана, як і паўсюдна, аб'яднаннем рабочых у адстойванні сваіх патрабаванняў да наймальнікаў. На дробных прадпрыемствах, якія пераважалі ў той час у прамысловасці Беларусі, склаліся цяжкія ўмовы працы, не выконвалася працоўнае заканадаўства, не падтрымліваліся элементарныя нормы тэхнікі бяспекі і санітарнага стану, нізкай заставалася плата за выраблену прадукцыю.

Прафсаюзны рух на Віцебшчыне, як і ўвогуле на Беларусі, насіў у пазначаныя гады рысы, характэрныя для еўрапейскага і сусветнага прафсаюзнага руху, а таксама меў і адметныя асаблівасці, якія былі абумоўленыя спецыфікай развіцця рэгіёна. Характэрным у пабудове тут прафсаюзных арганізацый, з першых крокаў станаўлення, была значная іх палітызацыя, надзвычайная актыўнасць пры параўнальнай малой колькасці членства, і, нарэшце, гэта – наяўнасць нацыянальнага фактару. Улічваючы колькасную перавагу на той момант у беларускіх гарадах яўрэйскага насельніцтва (што адносіцца і да Віцебшчыны), можна зрабіць выснову аб значнай пазітыўнай ролі бундаўскіх арганізацый і арганізацый РСДРП(б) у станаўленні прафсаюзнага руху.

Экскурс у мінулае і сучасная рэчаіснасць дазваляюць адзначыць: прафсаюзы паўсталі і існуюць у сувязі з аб'ектыўнай неабходнасцю. Гэта самая масавая і шматмэтавая з усіх грамадскіх арганізацый працоўных. З часу свайго стварэння прафсаюзы аказваюць пазітыўнае ўздзеянне на развіццё і захаванне працоўнага патэнцыялу грамадства. Там, дзе наёмныя работнікі змаглі стварыць і захаваць моцныя прафсаюзы, ім удалося выстаяць у супрацьстаянні з работадаўцамі і дасягнуць годнага ўзроўню аплаты працы і захавання сацыяльных ільгот.

## Літаратура


1. Мандрик, И.В. Белорусская железная дорога в 70–80-х годах XX столетия: исторический, социально-экономический и политический аспекты / И.В. Мандрик. – Витебск: УПП «Витебская областная типография», 2003. – 296 с.
2. Памяць: Гіст.-дакум. хроніка Віцебска: у 2 кн. Кн. 1 / рэдкал.: Г.П. Пашкоў (гал. рэд.) [і інш.]; маст. Э.Э. Жакевіч. – Мінск: БелЭн, 2002. – 648 с.: іл.
3. Мандрик, И.В. История профсоюзного движения Беларуси: история и современность / И.В. Мандрик // Труд. Профсоюзы. Общество. – 2004. – № 1. – С. 4–11.
4. История и современность профсоюзного движения: методические рекомендации для самостоятельной работы слушателей по повышению квалификации профсоюзных кадров. – Витебск: ВФ «МИТСО», 2007. – 32 с.
5. История профсоюзов СССР. Ч. 1 (1905–1937 годы). Изд. 2-е / под ред. Г.В. Шарапова. – М.: Профиздат, 1977. – 343 с.
6. Профсоюзное движение на Витебщине: история, опыт, уроки: пособие. – Витебск: ВФ МИТСО, 2000. – 102 с.: ил.
7. Алексеенков, П.В. К вопросу о зарождении профсоюзного движения на Витебщине / П.В. Алексеенков // Профсоюзное движение: история и современность. – Витебск, 1996. – С. 9–15.
8. Витебское областное объединение профсоюзов / Профессиональные союзы Беларуси. Энциклопедия: в 2 т. Т. 1 / под ред. проф. Л.П. Козика. – Минск: ФПБ, 2011. – С. 336–337.
9. Колосовский, С. Профсоюзы Беларуси: основные этапы пути / С. Колосовский // Беларускі час. – 1996. – 20–26 мая. – С. 5.
10. Страницы истории: возникновение первых профсоюзов // Профсоюзное обозрение. Хроника. События. Факты. – 1996. – № 7(15). – С. 1.
11. Дубовик, А. Профсоюзы Белоруссии: первые шаги / А. Дубовик // Человек и экономика. – 1990. – № 6. – С. 28.
12. Дергунова, Э.М. К истории создания профсоюзов Белоруссии / Э.М. Дергунова // Профсоюзное движение: история и современность. – Витебск, 1996. – С. 17.
13. Смирнов, Д.И. У истоков профсоюзного движения на Витебщине / Д.И. Смирнов // Профсоюзное движение: история и современность. – Витебск, 1996. – С. 16–20.
14. Пинсон, Б. Большевики в Витебске / Б. Пинсон. – Витебск, 1922. – С. 10.
15. Бич, М.О. Рабочее движение в Белоруссии в 1861–1904 гг. / М.О. Бич. – Минск: Наука и техника, 1973. – 280 с.
16. Мандрык, І.У. Гісторыя Беларусі (у кантэксце сусветнай гісторыі) / І.У. Мандрык // Віцебск: УА ФПБ "МІПСА" ВФ, 2009. – 276 с.
17. Давидюк, П.Г. Профессиональное движение: история, теория, практика / П.Г. Давидюк. – Минск: МИТСО, 1999. – 269 с.
18. История профсоюзного движения Беларуси (под ред. Л.П. Козика). – Минск: ФУ Аинформ, 2005. – 416 с.
19. Филяков, В.Г. Революционные связи рабочих Белоруссии и России в конце XIX – начале XX в. / В.Г. Филяков // под ред. М.О. Бича. – Минск: Наука и техника, 1987. – 142 с.
20. Мандрик, И.В. Хроника профсоюзного движения / И.В. Мандрик, Л.А. Лагеева // Віцебскі рабочы. – 1998. – 23 кастр. – С. 2.
21. Очерки истории профсоюзов Беларуси (1905–1969). – Минск: Наука и техника, 1970. – С. 16–20.
22. Витебск: энцикл. справ. / Белорус. сов. энцикл.; редкол.: И.П. Шамякин (гл. ред.) [и др.]. – Минск: БелСэ, 1988. – 408 с.: ил.
23. Смирнов, Д.И. Истоки профсоюзного движения на Витебщине / Д.И. Смирнов // Профсоюзное движение на Витебщине: история, опыт, уроки. – Витебск: ВФ МИТСО, 2000. – С. 6–12.
24. Первый съезд профсоюзов Витебской губернии / Профессиональные союзы Беларуси. Энциклопедия: в 2 т. Т. 1 / под ред. проф. Л.П. Козика. – Минск: ФПБ, 2011. – С. 138.
25. Мандрик, И.В. Профсоюзы как субъект социальной сплоченности общества / И.В. Мандрик // Совершенствование механизма регулирования социальных отношений в системе социального партнерства и диалога: материалы IX Междунар. науч.-практ. конф., посвященной 15-летию Витебского филиала МИТСО, 26–27 нояб. 2009 г. – Витебск: ВФ УО ФПБ МИТСО, 2010. – С. 178–179.


*Паступіў у рэдакцыю 01.06.2018 г.*